# СТРАТЫ, НАНЕСЕНЫЯ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ АШМЯНШЧЫНЕ

**Лоўчая Алена Сяргееўна,**
**Саваш Жанна Аляксанраўна**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
Навуковы кіраўнік– дацэнт ваеннай кафедры,
канд. мед. навук, дацэнт, палкоўнік м/с у адстаўцы Івашын В. М.

**Актуальнасць.** Ашмяншчына – унікальны куток беларускага краю. Славутыя і гераічныя, драматычныя і трагічныя старонкі есць у летапісе яе гісторыі. Трагічнымі падзеямі для нашай бацькаўшчыны з'яўляюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Вайна глубокай боллю адгукнулася ў сэрцах народа, адняла жыцце, спустошыла землі.

Актуальнасць дадзенай тэмы абумоўлена, з аднаго боку, неабходнасцю фарміравання нацыянальнай самасвядомасці на аснове глыбокіх ведаў гісторыі свайго краю, а з другога боку, чалавецтва не гарантавана ад магчымага пачатку новай сусветнай вайны і таму зварот да мінулага, яго трагічных старонак, неабходны для таго, каб не паўтарыць памылак.

**Мэта даследавання:** даследаваць сацыяльна-эканамічнае развіцце Ашмяншчыны, выявіць страты, нанесеныя раену ў гады вайны.

**Метады даследавання:**назіранне (азнаямленне і вывучэнне архіўных дакументаў, статыстычных даведнікаў); аналіз (адбор і сістэматызацыя матэрыялу для напісання работы); абагульненне (падвядзенне вынікаў працы, спроба ўласнага разумення); ілюстраванне (шляхам стварэння мультымедыйнай прэзентацыі).

**Вынік даследаванняў.** На досвітку 25 чэрвеня 1941 г. часці танкавага корпуса вермахта з боку Вільні ўвайшлі ў Ашмяны. Пачалася фашысцкая акупацыя. Больш трох гадоў мірным жыхарам давялося цярпець здзекі і гвалты, лілася нявінная кроў, смерць і пакуты прынеслі з сабой захопнікі.

Гітлераўскія носьбіты "новага парадку" у школьным пытанні яшчэ больш нарабілі бяды. Яны, напрыклад, у нашым раене ў час свайго "гаспадарання" зачынілі 62 школы. У раене, з дазволу сказаць, быццам бы "працавала" 27 школ. Спалены 3 школьныя будынкі. Па Ашмянскаму раёну, па маючымся звесткам, знішчана 40 працэнтаў школьнай мэблі і 100 працэнтаў наглядных дапаможнікаў. Поўнасцю знішчана раенная бібліятэка, у якой было ў 1941 г. 5896 кніг коштам у 12 502 рублі. Разбураны хаты-чытальні.

Дакумент «З акта, складзенага 24 мая 1945 года камісіяй па расследаванні злачынстваў, здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі раёна» сведчыць аб тым, што «немецко-фашистскими властями и их сообщниками расстреляно и замучено 1793 человека мирных жителей города Ошмяны и Ошмянского раёна:



Репозиторий ГрГМУ

3 и 4 июля 1941 года немецко-фашистскими властями под командованием 2 офицеров, на хуторе Бартели Ошмянского сельсовета расстреляно мирных жителей города Ошмяны 573 человека; 23 ноября 1942 года около бывшего имения Аглейбы Муравано-Ошмянковского сельсовета расстреляно немецкими властями 700 жителей района и города; 4 июля 1941 года по распоряжению немецких властей солдатами немецкой армии в лесу около деревни Ягеловщизна Полянского сельсовета расстрелено 353 человека жителей города Ошмяны; в ноябре месяце 1942 года около деревни Новосяды по приказанию немецких властей расстреляно 44 человека, в числе которых 42 цыгана; за период немецкой оккупации в 1941 году в м. Гольшаны расстреляно немцами 11 человек, в том числе женщина с ребенком» [7, с. 493].

У Лідскім занальным дзяржаўным архіве знаходзіцца дакумент, які сведчыць аб людскіх стратах па сельсаветах: па Ашмянскаму гарадскому Савету знішчана 439 чалавек, Доргішскі – 11, Каецяняцкі – 14, Куцавіцкі – 13, Маствілішскі – 8, Мур-Ашмянскі – 32, Палянскі – 8, Погірскі – 12, Навасядскі – 17. Вывезена ў Германію з Гальшанскага сельсавета 13, Ашмянскага – 101, Жупранскага – 2, Каецяняцкага – 8, Палянскага – 25, Стульгінскага – 16, Навасядскага – 20, Рудзішскага – 7 [2].

У дакуменце пералічаны і Лудскі сельсавет, ў графе вывезена у Германію ніводнага чалавека, але мы знайшлі звесткі аб тым, што з вёскі Луды былі вывезены два браты – Карней Петр і Часлаў, яны сталі вязнямі канцлагеру, выжылі, Пётр вярнуўся на радзіму, Часлаў застаўся за мяжой.

Архіўныя матэрыялы ўтрымліваюць звесткі аб знішчаныя весках поўнасцю або часткова на тэрыторыі Ашмянскага раёна.

Баруны – знішчана 30 дамоў поўнасцю, Бурцішкі – знішчана 8 дамоў, да вайны было 9 дамоў. Доржы – знішчана 34 дамы, Жупраны – 49 дамоў, Лаўжы – знішчана 6 дамоў, не засталося ні аднаго, Наваселкі – знішчана напалову, Нарушаўцы – знішчана 27 дамоў, Трасечаняты – знішчана 10 дамоў, да вайны было 10 дамоў. Кали браць данныя па сельсаветам, то ў Агародніцкім знішчана – 31, Ашмянскім – 81, Гальшанскім – 4, Граўжышкаўскім – 12, Жупранскім – 78, Кальчунскім – 18, Каецяняцкім – 64, Куцавіцкім – 14, Лудскім – 49, Палянскім – 6, Погірскім – 15, Семярніцкім – 69, Навасядскім – 33, Рудзішкаўскім – 7. У вёсках спалілі і знішчылі каля – 512 сялянскіх дамоў, у Ашмянах знішчана каля – 85 [2].

Страты, нанесеныя гаспадарцы раёна (знішчана, адабрана):

Жылых будынкаў – 468, надворных пабудоў – 888, сельскагаспадарчага інвентару – 786, коней – 1034, быкоў – 69, кароў – 1107, валоў рабочых – 20, маладняку буйнай рагатай жывелы – 1032, свіней – 1310, авечак і коз – 2092 птушак – 10243, пчол – 244, пасадак – 363, шматгадовых траў – 363, зерня – 20194,5 ц, мукі – 530 ц, бульбы – 22835 ц, фуражу – 10337 ц, іншых сельгаспрадуктаў – 481,3 ц.

Страты панеслі 3359 гаспадарак, агульная сума страт 225 242 405 тыс. руб. Аб стратах раена паведамляе і Ашмянская раённая газеты «Знамя свободы» ад 22 ліпеня 1944 г. Фашысцкія захопнікі, уцякаючы з Ашмян, нанеслі



Репозиторий ГрГМУ

гораду і раёну вялікі ўрон. У горадзе спалены дражджавы завод, узарваны плаціны і мост, на электрастанцыі пашкоджана электрасетка, поўнасцю выведзена са строю тэлефонная станцыя, разграблена маёмасць на прадпрыемствах у грамадскіх установах і дамах. [5]

**Вывады.** Захаванне памяці аб мінулым – адна з галоўных задач нашага пакалення. Мы часта перакрэсліваем і перакрыжоўваем межы гісторыі, аднак нельга пазбавіцца памяці народнай, асабліва тады, калі гэта тычыцца блізкага, роднага, самага каштоўнага – нашай спадчыны.

У працы назапашаны і апрацаваны матэрыял аб сацыяльна-эканамічным развіцці Ашмяншчыны ў даваенны час. На падставе архіўных дакументаў выяўлена колькасць буйнейшых прадпрыемстваў у раёне – 19, прамарцеляў – 6, млыноў каля – 15, электрастанцыі – 4 у Ашмянах, 1 – Жупранах, 2 невялікія ў Куцавічах і Гальшанах.

Значэнне работы бачым у тым, што нам удалося ў некаторай ступені даследаваць матэрыял па тэме і ўнесці невялікі ўклад у вывучэнне гісторыі Ашмяншчыны.

**Літаратура:**

1. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці за 1941-1944 гг. – ф. 4832, воп 43, спр. 16, 10. л. 43, спр. 24, л. 11.

2. Занальны дзяржаўны архіў у г. Лідзе за 1941-1945 гг. – ф. 1119, воп. 1, спр.8, л. 7, 49; ф.1149, воп. 1, спр.9, л. 1-4, 6-11, 17, 20.

## СВЯТЫ ВЯЗЕНЬ З АЎШВІЦ-БІРКЕНАЎ

**Лучко Санцціяна Хусамаўна,**
**Марцішэўская Марта Эдвінаўна**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
Навуковы кіраўнік – дацэнт ваеннай кафедры,
канд. мед. навук, дацэнт, палкоўнік м/с у адстаўцы Івашын В. М.

**Актуальнасць.** Па-першае, чалавек, аб якім пойдзе гаворка, працаваў перад пачаткам Другой сусветнай вайны на працягу некалькіх гадоў у Гародні. Таму будзе карысным папоўніць скарбонку подзвігаў нашай Радзімы ведамі пра яшчэ аднаго чалавека.

Па-другое, любоў заўседы трывае ў актуальнасці. Падчас вайны патрэба ў ей тым болей узрастае, дазваляючы народу не пасці духам і будаваць шлях да пабеды.

**Мэта даследвання.** Данесці веды студэнтам і іншым слухачам пра чарговы ахвярны подзвіг чалавека, які паўплываў на духоўнае развіцце Гродзеншчыны і не толькі.



Репозиторий ГрГМУ